*УДК 61:615.1(062)(476-25)*
*ББК 52я73*
*А 43*
*ISBN 978-985-21-1258-1*


***Дубоўская Г.І.***

# ЦІ ПАТРЭБНЫ БЕЛАРУСКІЯ КНІГІ СУЧАСНАМУ ЧАЛАВЕКУ?

***Навуковы кіраўнік: Качан А.С.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г.Мінск*

Мэта: паказаць важнасць і неабходнасць кніг, надрукаваных на беларускай мове.

Ці патрэбны нам кнігі пісьменнікаў на роднай мове? Вядома, так! Не часта сустракаеш людзей, якія размаўляюць на беларускай мове-прыгажуні. Для многіх людзей чытанне – самы лепшы від адпачынку, які расслабляе і супакойвае. Чытанне кніг на роднай мове выклікае любоў і патрыятызм да сваёй Радзімы ў кожнага чалавека.

“Любіце кнігу, бо яна крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы”, – сцвярджаў Францыск Скарына. Кніга – гэта партал у дзівосны свет, напоўнены цудамі і яркімі фарбамі. Яна вучыць не толькі пісаць, маляваць, а адчуваць і бачыць прыгажосць навокал. Галоўная мэта кнігі – гэта выхаваць сапраўднага чалавека.

Тэма Радзімы праходзіць тонкай ніццю праз творы Ніла Гілевіча. Яго вершы напоўнены любоўю да сваёй зямлі, мовы. Паэт у поўнай меры адданы ўласнай старонцы. Гэта найбольш моцна адчуваецца ў вершы “Паклон табе, мой беларускі краю”.

Менавіта рукой Алеся Разанава была напісана знакамітая монастрафа: “Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор – мова”. Усяго адзін радок, а які глыбокі сэнс змешчаны ў ім! Алесь Разанаў нас не толькі вучыць, але і дае магчымасць задумацца, паразважаць.

Вядомая беларуская пісьменніца Лідзія Полазава ў вершы “Родная мова” паказвае любоў да беларускай мовы.

Кніга – невычэрпная крыніца ведаў і адданы сябар, які суправаджае нас з самага ранняга дзяцінства. Чалавек, які любіць чытаць і разважаць аб прачытаным, ніколі не засумуе ад гультайства і адзіноты.

Не можа быць сучаснага без мінулага. Трэба шанаваць сваю Радзіму і ведаць яе гісторыю. Кніга, надрукаваная на беларускай мове, – свет цудоўнага і такога роднага для нас, беларусаў, што ўсё больш пачынаеш разумець немагчымасць існаваць без роднага краю.

Сучаснае пакаленне стварыла электрамабілі, камп’ютары, развівае навуку, але шчасце ў самых простых рэчах. “Чалавек – гэта цэлы свет”,– сцвярджаў Кузьма Чорны. Значыць, чалавек можа ўсё: можа ўзбагаціць нашу мову, можа аберагаць яе, змагацца за яе, каб не страціць зусім.

“Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, а хто забыў сваю мову – усё згубіў”, – папярэджваў нас Уладзімір Караткевіч.